

Стандарту IWAY

# Раздзел аб жыллёвых памяшканнях

*Дадатковыя патрабаванні да Агульнага раздзелу, якія датычацца жыллёвых памяшканняў*

Дадзены дакумент з'яўляецца перакладам Раздзелу IWAY Стандарту аб жыллёвых памяшканнях, выпуск 6.0. Дадзены пераклад прызначаны толькі для інфармацыйных мэтаў і не можа разглядацца як дамоўны дакумент. Ангельская версія з'яўляецца адзіным афіцыйным дакументам, на які можна спасылацца ў выпадку разыходжанняў у інтэрпрытацыі і іншых разыходжанняў.

Усе іншыя патрабаванні, якія знаходзяцца ў IWAY Стандарце у роўнай ступені прымяняюцца да *жыллёвых памяшканняў* і камунальных памяшканняў (напр. дзеянні ў надзвычайных сітуацыях, бяспека будынкаў і электрабяспека).

**ВЫПУСК 6.0 ВЫДАДЗЕНА: ВЕРАСЕНЬ 2019** - **© Inter IKEA Systems B.V. 2019**

# 3 Дзеці знаходзяцца пад абаронай, таксама прасоўваюцца магчымасці для працы, навучання і сямейнага жыцця

## АБАРОНА ДЗЯЦЕЙ

БАЗАВЫ

A 3.1 *Дзеці*, якія пражываюць у жыллёвых памяшканнях, не маюць доступу да небяспечных абшараў.

## МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ СЯМЕЙНАГА ЖЫЦЦЯ

ВЫДАТНЫ

A 3.2 Для падтрымкі сямейнага жыцця як мінімум:

- Выдаюцца *жыллёвыя памяшканні для сем'яў*.
- Забяспечваюцца магчымасці атрымання адукацыі і пасляшкольных праграм для дзяцей працаўнікоў, калі няма іншых магчымасцяў у бацькоў.
- ёсць у наяўнасці бяспечныя месцы для гульняў дзяцей.

# 7 Прыдатныя умовы працы і побыту

## ПРАВЫ ЖЫХАРОЎ

АБАВЯЗКОВЫ

A 7.1 *Працаўнікі* не абавязаны пражываць ў вызначаным *жыллёвым памяшканні.*

A 7.2 *Жыхары* маюць права пакідаць *жыллёвыя памяшканні* ў любы час.

БАЗАВЫ

A 7.3 *Жыхары* разумеюць свае правы і абавязкі і маюць копію правілаў пражывання ў *жыллёвых памяшканнях.*

A 7.4 *Жыхары* атрымліваюць рахунак на ўсе панесеныя выдаткі за пражыванне, а таксама пацверджанне здейсненых імі плацяжоў.

A 7.5 Кошт пражывання ў *жыллёвых памяшканнях* не перавышае сярэднерынкавага кошту.

ПРАСУНУТЫ

A 7.6 Арганізоўваецца доступ да выгодаў, такіх як банкаўскія паслугі, гандлёвыя паслугі і медычнае абслугоўванне.

## ЖЫЛЛЁВЫЯ ПАМЯШКАННІ

БАЗАВЫ

A 7.7 *Жыллёвыя памяшканні* маюць трывалую канструкцыю і маюць натуральнае і штучнае асвятленне, бесперабойнае энэргазабеспячэнне, водазабеспячэнне, абарону ад неспрыяльных умоваў надвор’я, вентыляцыю і, калі неабходна, ацяпленне.

A 7.8 *Жыллёвыя памяшканні* не размяшчаюцца ў будынках дзе праводзяцца аперацыі павышанай рызыкі. *Жыллёвыя памяшканні* размешчаныя наводдаль ад гучных крыніц шуму.

## АСАБІСТАЯ ЖЫЛЛЁВАЯ ПРАСТОРА

**БАЗАВЫ**

A 7.9 Калі *жыллёвыя памяшканні* для мужчын і жанчын размешчаны ў адным будынку, асобныя пакоі для кожнага полу павінны быць забяспечаны, з выключэннем, калі *жыхары* вырашаюць пражываць разам у двухмесцавым пакоі.

A 7.10 Кожны пакой мае плошчу не меньш за 3,8 м2, памножаную на колькасць *жыхароў*. Вышыня столі не меньш 2,1 м. У выпадку сумеснага пражывання ў пакоі адначасова могуць пражываць максімум 8 чалавек, незалежна ад наяўнасці вольных месцаў.

A 7.11 Кожны жыхар надзяляецца асабістым ложкам і матрасам альбо спальным матам, індывідуальным месцам для захоўвання каштоўнасцей, якое зачыняецца; індывідуальным месцам для захоўвання іншых асабістых рэчаў і ключ, альбо эквівалент, ад пакою. Кожны пакой можна зачыніць як знутры, так і звонку.

**ПРАСУНУТЫ**

A 7.12 У пакоях сумеснага пражывання, ажыццяўляюцца захады па паляпшэнні прыватнасці *жыхароў.*

**ВЫДАТНЫ**

A 7.13 *Працаўнікі* забяспечаны асобнымі пакоямі для пражывання.

## КАМУНАЛЬНЫЯ ПАМЯШКАННІ

**БАЗАВЫ**

A 7.14 *Жыллёвыя памяшканні* маюць вызначаныя месцы для гатавання ежы, у якіх падтрымліваецца чысціня і працоўны стан. Гатаванне ежы адбываецца толькі ў вызначаных для гэтага месцах. Месцы для гатавання ежы могуць быць замененыя на давоз харчавання альбо эквівалент.

A 7.15 *Жыллёвыя памяшканні* маюць душы і туалеты, з гендэрным падзелам і колькасцю прапарцыйнай колькасці *жыхароў.* Душы маюць гарачую ваду.

**ПРАСУНУТЫ**

A 7.16 Створаны месцы для адпачынку.

A 7.17 Створаны ўмовы для аптымальнага адпачынку для хворых *жыхароў* і ізаляцыі ад іншых.

# Слоўнік

***Жыллёвыя памяшканні*** — Жыллёвая плошча (на тэрыторыі прадпрыемства альбо паза межамі, на трывалы тэрмін альбо не), якая забяспечваецца пастаўшчыком альбо ад імя пастаўшчыка, уключае ў сябе *асабістую жыллёвую прастору* і *камунальныя памяшканні.* Кабіны цягачоў не лічацца *жыллёвымі памяшканнямі.*

***Камунальнае памяшканне*** — Частка *жыллёвага памяшкання*, якая знаходзіцца ў сумесным карыстанні з іншымі *жыхарамі*. Напрыклад: агульныя кухні, душы і туалеты, пральні і зоны адпачынку.

***Жыхар*** — Асоба, якая пражывае ў *жыллйвых памяшканнях.* У лік *жыхароў* уваходзяць: *працаўнікі*, а у некаторых выпадках, і іх сем'і.

***Працаўнік*** — Асоба, якая працуе на поўны альбо непоўны працоўны дзень. У гэтую катэгорыю ўваходзяць працаўнікі са здельнай аплатай, асобы на практыцы і працаўнікі на выпрабавальным тэрміне, а таксама *працаўнкі* суб-падрадчыкаў, якія працуюць на тэрыторыі прадпрыемтсва на тыдзень васемнадцаць (18) гадзін і больш.